Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»
пр. Незалежнасці, 98, 220114, г. Мінск
т. (017) 267 10 02, т./ф (017) 267 31 32
р/р 3012013631137
ААТ «ААБ Беларусбанк» філіял 514, МФА 153001514

Министерство культуры Республики Беларусь
Республиканское унитарное предприятие
«Национальная киностудия «Беларусьфильм»
пр. Независимости, 98, 220114, г. Минск
т. (017) 267 10 02, т./ф (017) 267 31 32
р/с 3012013631137
ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал 514, МФО 153001514

17.06.2016 № 01-18/1510

На № ________ ад ________

Аб звароце грамадзян

Паважаны

У адказ на калектыўны зварот грамадзян аб ушанаванні 100-гадовага юбілею са дня абвяшчэння БНР, дасланы ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» у межах сваёй кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Для стварэння таго ці іншага кінапраекту, незалежна ад яго зместа і фармату, неабходна выкананне шэрагу ўмоў.

Па-першае, неабходна мець гатовы літаратурны сцэнарый фільма. «Беларусьфільм» не мае штатных драматургаў і працуе з гатовымі сцэнарыямі, якія дасылаюць на разгляд аўтары ці кінакампаніі.

Дасланыя кінасцэнарыі павінны прайсці Рэдакцыйны, а потым Мастацкі саветы кінастудыі, якія ацэньваюць мастацкую якасць і прыдатнасць матэрыялаў для вытворчасці фільмаў.

Па-другое, неабходна мець крыніцы фінансавання. Кінастудыя «Беларусьфільм» не мае ўласных сродкаў і выкарыстоўвае для вытворчасці фільмаў сродкі дзяржаўнага бюджэтнага фінансавання.

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №567 ад 5 снежня 2011 г. «Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы і стымуляванню развіцця кінематаграфіі» рашэнне аб фінансаванні і запуску ў вытворчасць кінапраэктаў прымаецца па выніках адкрытага рэспубліканскага конкурсу кінапраэктаў, які праводзіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўнае фінансаванне ў поўным памеры выдзяляецца выключна на вытворчасць кінапраэктаў са статусам «нацыянальны фільм», фільмаў для дзяцей і юнацтва, а таксама для рэжысёрскіх дэбютаў. Іншыя кінапраэкты атрымоўваюць часткавае дзяржаўнае

фінансаванне ў памеры не больш за 70% ад іх бюджэтнага кошту, пры абавязковай наяўнасці крыніц дадатковага фінансавання, а таксама з гарантыяй камерцыйнай рэалізацыі кінапраэкта, якая забяспечвае яго акупнасць у памеры 70% ад бюджэтнага кошту на працягу трох гадоў.

Згодна з Палажэннем «Аб адкрытым рэспубліканскім конкурсе кінапраэктаў на вытворчасць нацыянальных фільмаў і фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў» Міністэрства культуры вызначае тэмы кінапраэктаў, якія могуць прэтэндаваць на дзяржаўнае фінансаванне і дапускаюцца да ўдзелу ў конкурсе.

Такім чынам, для стварэння фільма на кінастудыі «Беларусьфільм» неабходны якасны сцэнарый, адпаведная тэма адкрытага рэспубліканскага конкуру кінапраектаў і перамога ў ім.

З павагай,

Генеральны дырэктар
кінастудыі І.В.Поршнеў

Костюченко 267 10 21